І. У. СУБАЧ

# КАЛЕКЦЫІ ТЫШКЕВІЧАЎ ЯК ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Лагойшчына славіцца сваёй багатай і старажытнай гісторыяй, якая непарыўна звязана з родам Тышкевічаў.

Прадстаўнікі гэтай дынастыі на працягу больш чатырох стагоддзяў валодалі горадам і як маглі спрыялі яго развіццю. Так, дзякуючы дзейнасці братоў Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў у XIX ст. Лагойск стаў цэнтрам археалагічнай і гістарычнай навукі.

У 1842 г. браты Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы адчынілі ў Лагойску першы ў Беларусі гісторыка-археалагічны музей. Браты Тышкевічы былі вядомымі археолагамі, фактычна заснавальнікамі беларускай навуковай археалогіі.

Яны раскапалі і вывучылі некалькі соцень старажытных курганоў, даследавалі і апісалі старажытнасці амаль усяго паўночна-заходняга ўзвышша Міншчыны. Археалагічныя знаходкі Тышкевічаў і паклалі пачатак музею ў Лагойску. Музей Тышкевічаў месціўся ў двухпавярховым палацы, пабудаваным у 1814–1819 гг. на высокім беразе Гайны. Прыгожы, у класічным стылі, палац меў плошчу 70х20 м (зруйнаваны ў час Вялікай Айчыннай вайны). У нумізматычнай калекцыі Тышкевічаў налічвалася 1140 медалёў і манет. Сярод трох тысяч кніг, сабраных у бібліятэцы музея, было каля 500 старажытных помнікаў айчыннага кнігадрукавання. У бібліятэцы захоўваліся таксама рукапісы, старадаўнія геаграфічныя карты і граматы.

З унікальных мастацкіх вырабаў увагу спыняў вялікі крыж са срэбра і золата, падараваны польскім каралём Жыгімонтам І Старым у 1514 г. касцёлу мястэчка Гайна, што ў 10 км ад Лагойска. Былі яшчэ ў музеі два мячы з мініяцюрным партрэтам польскага караля Стэфана Баторыя (1533–1586) на эфесах, з подпісам і дэвізам, шпага Пятра І, шведскія сцягі.

Лагойскі музей быў і своеасаблівым арсеналам з вялікім камплектам рознай зброі. Захоўваліся тут зброя, кальчугі, мундзіры часоў французска-расійскай вайны 1812 г. Музей меў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

багатую калекцыю ручнікоў, сурвэтак, абрусаў, што ткаліся на фабрыцы льняных і бабаўняных вырабаў, заснаванай Канстанцінам Тышкевічам.

Партрэты прадстаўнікоў 500-гадовага лагойскага роду Тышкевічаў займалі значнае месца ў музеі. Амаль усе партрэты – у натуральную велічыню, па пояс альбо на ўвесь рост.

«Вялікую» і «малую» залы палаца займалі творы майстроў Рыма, Фларэнцыі, Неапаля – 200 экспанатаў. Было тут 48 копій з замалёвак грэчаскага Парфенона, былі прадметы раскопак Пампеі, рэчы, здабытыя ардынатарам літоўскага горада Біржай Міхаілам Тышкевічам, таксама археолагам (1828–1897), у час яго раскопак у Егіпце.

Шмат твораў з лагойскага музея звезлі ў Літву, Львоў, Варшаву, Кракаў. Многія са збораў К. Тышкевіча аказаліся ў Румянцаўскім музеі ў Маскве (цяпер Дзяржаўны гістарычны музей). Існаваў таксама музей Тышкевічаў і ў Вільні. Музеі братоў пакінулі значны след у развіцці археалогіі, этнаграфіі, гістарыяграфіі і мастацтва Беларусі. Пачынаючы з 30-х гг. XIX ст. Тышкевічы прысвяцілі сваё жыццё вывучэнню старажытнай гісторыі Беларусі. Першым сумесным выданнем Тышкевічаў было «Апісанне Барысаўскага павета» 1847 г. на польскай мове. У 1858 г. К. Тышкевіч выдаў «Помнікі айчыннай гравюры» на польскай мове.

Браты Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы былі ганаровымі членамі Акадэміі навук у Пецярбурзе, Акадэміі навук у Швецыі, Інстытута археалогіі ў Лондане, шматлікіх айчынных і замежных навуковых таварыстваў [2].

Да цяперашняга часу толькі часткова захаваліся фрагменты левага крыла Лагойскага палаца і мы можам ацаніць яго прыгажосць толькі дзякуючы некалькім малюнкам Напалеона Орды і некалькім фотаздымкам. У лепшым стане знаходзіцца парк, закладзены адначасова з палацам, які складаў частку архітэктурнага ансамбля Лагойскага маёнтка Тышкевічаў, і які да цяперашняга часу застаецца адной са славутасцей Лагойска.

Лагойскі музей старажытнасцей займаў дзве альбо тры залы палаца. Значнасць музея ў свой час ацанілі такія вядомыя асобы, як Ю. Крашэўскі, К. Тызенгаўз, М. Балінскі і інш. Адам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіркор у свой час вельмі высока ацаніў экспазіцыю музея і аднаго з яго стваральнікаў – К. Тышкевіча.

Наваколлі Лагойска багатыя на старажытныя гарадзішчы, замкі і мноства курганоў, з якіх значная частка дасканала даследавана ўладальнікам Лагойска графам Канстанцінам Тышкевічам. Здабытыя прадметы старажытнасцей паклалі падмурак адметнаму музею дагістарычных старажытнасцей, які і зараз змяшчаецца ў лагойскіх палатах. Па колькасці прадметаў і навуковым значэнні музей гэты можа быць параўнаны толькі з Віленскім і Кракаўскім універсітэтамі.

Класічным апісаннем экспазіцыі Лагойскага музея старажытнасцей для шмат якіх з даследчыкаў, якія займаліся яго вывучэннем, лічыцца яе апісанне этнографам П. М. Шпілеўскім, які наведаў Лагойскі маёнтак Тышкевічаў у 50-х гг. XIX ст.: «У цяперашні час кніг налічваецца да 3000 тамоў выбраных сачыненняў, больш на польскай і французскай мовах, з якіх каля 500 старажытных, і некалькі рукапісаў, аўтографаў і грамат. Медалёў і манет захоўваецца 1140 штук, якія тычацца большай часткай польскай гісторыі. З прадметаў рэдкасцяў у архіве заслугоўваюць увагі: царкоўны крыж часоў Жыгімонта I, два старых мяча з пазалочанымі выявамі Стэфана Баторыя, сцяг, адабраны ў шведаў Стэфанам Чарнецкім і шпага (шабля) Пятра Вялікага. З прадметаў мастацтваў і майстэрстваў адметныя: 200 карцін італьянскага жывапісу, часткова копій, часткова арыгінальных твораў Рыма, Фларэнцыі і Неапаля, 48 копій барэльефаў грэчаскага Пантэона, некалькі медалёў з груднымі выявамі і бюсты – творы вядомага аматара-скульптара, навагрудскага абшарніка Рафаіла Слізеня, 220 гравіраваных медных блях літоўскай вытворчасці XVII ст., якія сталіся важным матэрыялам для вывучэння гісторыі гравіравання ў Старажытнай Літве, нарэшце, сабранне старажытных этрускіх ваз з ліку знойдзеных у Пампеі і Геркулануме» [3].

«Нататкі Віленскай археалагічнай камісіі» за 1856 г., г. зн. на момант адкрыцця музея старажытнасцей у Вільні, паведамляюць: «Графам Тышкевічам ахвяраваныя ім прадметы старажытнасцей і іншыя навуковыя дапаможнікі, з якіх склаліся шэраг аддзелаў, у тым ліку і багатая бібліятэка:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Калекцыя манет і медалёў, якая складалася з блізу 3000 экзэмпляраў.

2. Калекцыя гравюр, палітыпажоў, геаграфічных мапаў і атласаў, медных гравіраваных дошак, лікам больш за 1000 экзэмпляраў; у ліку гравюр некалькі вельмі рэдкіх, асабліва вядомых гравёраў: Хадавецкага, Плонскага, Гр. Серакоўскага і шм. інш.

3. Аддзяленне бюстаў, карцін і партрэтаў.

4. Сабранне розных дыпломаў, старажытных рукапісаў, аўтографаў усіх асобаў, якія валадарылі ў Вялікім Княстве Літоўскім, пачынаючы ад Аляксандра.

5. Аддзел векапомнасцяў. Між іншым тут заслугоўваюць увагі срэбная даразахавальніца працы сярэдніх вякоў, старaславянскія загалоўныя шрыфты Супрасльскай друкарні, пярсцёнак першага ўніяцкага Мітрапаліта, бурштынавая выява Жыгімонта III і мноства іншых рэчаў. Асабліва выдатныя пячаткі з гярбамі амаль усіх дваранскіх радоў тутэйшага краю, а таксама пячаткі розных гарадоў, якія карысталіся Магдэбургскім правам.

6. Уласна Археалагічная калекцыя, якая складалася з 2000 прадметаў, у ліку якіх некалькі паганскіх ідалаў, слязніцы, попельніцы, урны, розныя металічныя ўпрыгожанні старажытных славян і літоўцаў, адкапаныя з курганоў, каменныя ядры з Віленскага, Стара-Трокскага і Менскага замкаў, блізу 500 каменных молатаў мясцовых і каля 100 Скандынаўскіх, прывезеных Гр. Тышкевічам са Швецыі для параўнання; ваенныя даспехі, зброя наступальная і абараняльная і таму падобнае».

Натуральна, што ўсе рэчы з пералічанага спіса з Лагойскага музея патрапілі ў Віленскі музей, заснаваны Яўстафіем Тышкевічам (ён таксама з'яўляўся і апекуном музея) і адчынены для наведвальнікаў у 1856 г. Але пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. і загаду Віленскага губернатара Мураўёва рэквізаваць музей, Я. Тышкевіч зняў з сябе абавязкі апекуна над ім.

Значная частка прадметаў з сабрання Тышкевічаў, у тым ліку і бібліятэка, разышлася па музеях розных краін: Маскоўскі Румянцаўскі музей, музей археалогіі ў Кракаве, Нацыянальны музей у Варшаве [3].

Бібліятэка складалася з 3000 тамоў, выключна прысвечаных старажытнасцям гісторыі і бібліяграфіі, ахвяраваных Гр. Тышкевічам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін «бібліятэка» паходзіць ад грэч. «bibliotheke», дзе «biblion» азначае – кніга, а «theke» – сховішча. Яго змест трактаваўся прадстаўнікамі розных школ і эпох далёка неадназначна, і змяняўся разам са змяненнем уяўленняў аб месцы і ролі бібліятэкі ў жыцці грамадства. Нягледзячы на шматлікія даследаванні, бібліятэказнаўцы так і не прыйшлі да агульнай высновы аб сутнасці бібліятэкі. У выніку колькасць вызначэнняў тэрміна «бібліятэка» ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. не толькі не зменшылася, а, наадварот, павялічылася. Шматзначнасць тэрміна «бібліятэка» з’яўляецца аб’ектыўнай рэальнасцю сённяшняй навукі, што знайшло сваё адлюстраванне ў апошніх выпусках энцыклапедычных выданняў, якія вызначаюць бібліятэку, як правіла, выкарыстоўваючы 3–4 дэфініцыі.

Такім чынам, бібліятэка дазваляе сканцэнтраваць у адной кропцы прасторы дыскрэтную інфармацыю, зафіксаваную на розных відах дыяхронных дакументаў, створаных у розных месцах, у розны час і рознымі аўтарамі, што значна павялічыла патэнцыйныя магчымасці чалавецтва па перадачы інфармацыі не толькі сучаснікам, але і нашчадкам. Так як асноўнай прычынай узнікнення бібліятэкі і яе існавання на працягу тысячагоддзяў з’яўляюцца патрэбы чалавецтва ў інфармацыі, то задавальненне гэтых патрэб выступае ў якасці сэнсу, мэты дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута. Абавязковай умовай існавання любога сацыяльнага інстытута з’яўляецца фарміраванне патрэб больш высокага ўзроўню на базе задаволеных. Фарміраванне бібліятэкай у сваіх наведвальнікаў новых інфармацыйных патрэб вядзе да пастаяннага духоўнага развіцця карыстальнікаў і служыць перадумовай для пастаяннага павелічэння попыту на паслугі бібліятэк, а значыць умацавання яе пазіцый на рынку інфармацыі і вольнага часу.

Сутнасць бібліятэчнай прафесіі заключаецца ў адборы з агульнага патоку сацыяльна значных дакументаў, стварэнні іх пошукавых вобразаў і забеспячэнні доўгачасовага захоўвання і эфектыўнага выкарыстання.

Для эфектыўнага задавальнення інфармацыйных патрэб недастаткова вытворчасці саміх дакументаў. Неабходна забяспечыць іх канцэнтрацыю ў пэўных кропках прасторы, захоўванне і прадастаўленне карыстальнікам у патрэбны момант.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэтыя функцыі ў грамадстве выконвае бібліятэка, якая вызначаецца намі як інтэгратыўны сацыяльны інстытут, які ажыццяўляе збор, захоўванне і распаўсюджванне ў прасторава-часавым кантынууме сацыяльна значных дакументаў з мэтай задавальнення інфармацыйных патрэб карыстальнікаў. Бібліятэка (незалежна ад таго, як яна будзе называцца) будзе існаваць да таго часу, пакуль у чалавецтва не адпадзе патрэба ў сродках захоўвання і перадачы інфармацыі [4].

На жаль, арыгінальнымі экспанатамі, якія належалі некалі Лагойскаму збору, цяперашні музей імя братоў Тышкевічаў не валодае. Таму яго супрацоўнікі ў мэтах атрымання інфармацыі і атрымання дапамогі ў набыцці копій матэрыялаў Лагойскага сабрання графаў Тышкевічаў наладжвалі сувязі з:

1. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў.
2. Архіў Акадэміі Навук Польшчы.
3. Маскоўскі Румянцаўскі музей (Дзяржаўны Гістарычны музей).
4. Брытанская амбасада.
5. Нацыянальны архіў Літвы. Нацыянальная Бібліятэка Вільнюскага ўніверсітэта.
6. Нацыянальны музей Варшавы.
7. Нацыянальная Бібліятэка Варшавы.

Музей пастаянна папаўняецца новымі экспанатамі. У год 70-годдзя Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі фонд музея папоўніла калекцыя франтавых лістоў (больш за 43 адзінкі), унікальным экспанатам для музея стала газета «Праўда» ад 10 мая 1945 года.

Музей прыадкрывае слаўныя старонкі гісторыі Лагойскай зямлі і расказвае пра мужных людзей, якія навекі ўпісалі сваё імя ў летапіс роднага краю.

---

*1.* Гісторыка-культурная спадчына Свіслацкага краю (да 760-годдзя горада Свіслач) : Шостыя Тышкевіцкія чытанні, Свіслач, 2 верасня 2016 г. : зб. арт. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Свіслац. райвыканкам ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2018. – 120 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.* Лагойскі музей братоў Тышкевічаў. Ч. 1 // Лагойск : віртуальны музей. – Рэжым доступу: http://museum.logoysk.info/be/tyszkiewicz/62-archeology/692-tyszkiewicz-brothers-museum-in-lahojsk-part1.html.

*3.* Лагойскі музей братоў Тышкевічаў. Ч. 2 // Лагойск : віртуальны музей. – Рэжым доступу: http://museum.logoysk.info/be/tyszkiewicz/62-archeology/1062-tyszkiewicz-brothers-museum-in-lohojsk-part2.html.

*4. Мотульский Р. С.* Библиотека как социальный институт / Р. С. Мотульский. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры, 2002. – 374 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ